**2024 г. - 80 гадоў з часу фарміравання Ваеннага камісарыята Кобрынскага і Жабінкаўскага раёнаў (Кобрынскага раённага ваеннага камісарыята; 1944)**



Гісторыя Кобрынскага раённага ваеннага камісарыята пачынаецца з 18 ліпеня 1944 года. На аснове загаду камандуючага Беларускай ваеннай акругай № 0347 і дырэктывы Брэсцкага абласнога ваеннага камісарыята быў сфарміраваны Кобрынскі раённы ваенны камісарыят. Супрацоўнікі ваенкамата адразу прыступілі да наладжвання воінскага ўліку і пошуку рэсурсаў для папаўнення франтавых часцей, уносілі свой уклад у Вялікую Перамогу.

Па завяршэнні Вялікай Айчыннай вайны супрацоўнікі райваенкамата вялі работу па пастаноўцы на ўлік дэмабілізаваных афіцэраў, салдат, аказвалі дапамогу ў пытаннях працаўладкавання і перакваліфікацыі. Вялікая ўвага надавалася падрыхтоўцы моладзі да службы ў арміі, ваенна-патрыятычнаму выхаванню.

У красавіку 1963 года ў сувязі з пераходам на новы штат райваенкамат перайменаваны ў Кобрынскі аб’яднаны гарадскі ваенны камісарыят, які ў той час быў у складзе Беларускай ваеннай акругі, у 1992 годзе ўвайшоў у склад Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

1 верасня 2002 года ў працэсе рэфарміравання Узброеных Сіл Кобрынскі аб'яднаны гарадскі ваенны камісарыят пераведзены на новы штат і зноў перайменаваны ў Кобрынскі раённы ваенны камісарыят. У 2015 годзе ў працэсе рэструктурызацыі да ваеннага камісарыята Кобрынскага раёна далучылася адпаведная ўстанова Жабінкаўскага раёна. Аб'яднанне адбылося ў адпаведнасці з дырэктывай міністра абароны № 29 ад 31 снежня 2014 года. Новая назва - «Ваенны камісарыят Кобрынскага і Жабінкаўскага раёнаў». Аб'яднаны ваенкамат узначаліў палкоўнік Ігар Уладзіміравіч Круглоў. На базе Жабінкаўскага камісарыята ўтворана адасобленая група, у якую ўваходзяць два афіцэра і трое спецыялістаў, кіраўнік падпалкоўнік Эдуард Рыгоравіч Аксюціч. Усе функцыі па ўліку ваеннаабавязаных, ветэранаў вайны, «афганцаў», «чарнобыльцаў», ветэранаў Узброеных Сіл засталіся ў Жабінцы і Кобрыне; медыцынскі агляд

прызыўнікі таксама праходзяць на месцах, а ваенныя білеты ўжо выдаюцца толькі ў Кобрыне.

Ваенны камісарыят Кобрынскага і Жабінкаўскага раёнаў з’яўляецца мясцовым органам ваеннага кіравання і воінскай установай Міністэрства абароны. Асноўныя крытэрыі работы - гатоўнасць да правядзення мабілізацыі людскіх і транспартных рэсурсаў на тэрыторыі раёна ў мірны і ваенны час, а таксама стан улікова-прызыўнай працы ў ваенкамаце, якаснае правядзенне мерапрыемстваў па тэрытарыяльнай абароне. Асновай дзейнасці ўсіх падраздзяленняў ваенкамата з'яўляецца шырокі і разнастайны спектр работы з людзьмі.

Адзін з найбольш складаных накірункаў дзейнасці ваеннага камісарыята - арганізацыя тэрытарыяльнай абароны ў раёне, асноўным працоўным і каардынуючым органам якой з'яўляецца група тэрытарыяльнай абароны. Да арганізацыі гэтай работы прыцягваюцца службовыя асобы раённага выканаўчага камітэта, тэрытарыяльных органаў МУС, КДБ і МНС, прадстаўнікі органаў пагранічнай службы, іншых органаў і арганізацый раёна.

Арганізацыя дапрызыўнай падрыхтоўкі і медыцынскага агляду, падрыхтоўка да службы ва Узброеных Сілах і іншых сілавых структурах, прызыў на тэрміновую службу і службу ў рэзерве, а таксама аказанне дапамогі абітурыентам, якія паступаюць у ваенныя навучальныя ўстановы - гэтыя пытанні знаходзяцца ў падпарадкаванні аддзела прызыву на ваенную службу. Асноўныя задачы мабілізацыйнага аддзела - гэта ўлік і падрыхтоўка ваеннаабавязаных да мабілізацыі ў ваенны час, а таксама да вучэбных і праверачных збораў.

Спецыялісты ваенкамата аказваюць садзейнічанне ў своечасовым і поўным прадастаўленні звольненым у запас ільгот, правоў і сацыяльных гарантый, устаноўленых заканадаўствам, вядуць улік грамадзян, якія прымалі ўдзел у баявых дзеяннях па абароне Айчыны і ў зонах узброеных канфліктаў, а таксама асоб, якія ўдзельнічалі ў ліквідацыі наступстваў аварый і стыхійных бедстваў. Камісарыят вядзе вялікую пошукавую працу, рыхтуюць дакументы і арганізуюць уручэнне ўзнагарод вайскоўцам запасу, франтавікам. Сумесна з органамі мясцовага самакіравання ўдзельнічае ў мерапрыемствах па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войн, збірае звесткі па няўлічаных воінскіх пахаваннях.

Ваенны камісарыят Кобрынскага і Жабінкаўскага раёнаў неаднаразова прызнаваўся лепшым у вобласці і рэспубліцы. Сучасны калектыў ваенкамата на чале з ваенным камісарам Кобрынскага і Жабінкаўскага раёнаў Аляксандрам Валер'евічам Самарэвічам – гэта згуртаваная каманда спецыялістаў, кожны з якіх добрасумленна выконвае свае абавязкі.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2024 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Военные** комиссариаты Брестской области : историческая справка. – Брест : Областная типография, 1998. – 48 с.

**Кобрынскаму** раённаму ваеннаму камісарыяту (1944) - 80 гадоў // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская РЦБС, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 138.

**Белов, Д**. Призвание — хранить грядущее страны / Дмитрий Белов ; фото: Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2024. — 17 лютага (№ 7). — С. 1, 6 : фот.

О кобринчанине Денисе Хурсине, который служит в Кобринском военном комиссариате.

**Самаревич, А.** Служить во имя Родины / Александр Самаревич // Кобрынскі веснік. - 2024. — 13 красавіка (№ 15). — С. 13 : фот.

Военный комиссариат Кобринского и Жабинковского районов отмечает свой профессиональный праздник.

**Белов, Д.** И сердце женское в ответе — за всех сынов и за Отчизну / Дмитрий Белов ; фото: Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2022. -19 кастрычніка (№ 80). - С. 5 : фот.

О начальнике мобилизационного отдела военного комиссариата Кобринского и Жабинковского районов О. Романус.

**Белов, Д.** Служить на границе — почетно / Дмитрий Белов ; фото: Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2022. — 12 кастрычніка (№ 78). — С. 3 : фот.

В военном комиссариате проходил отбор в подразделения пограничной службы.

**Белов, Д**. Офицер — это навсегда / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2019. — 23 лютага. — С. 1, 2.

Быть защитником своего рода и своей земли — жизненный путь бывшего военного комиссара Кобринского района Н. В. Лебецкого.

**Вовк, Ю.** Военкомат: история, современность, успехи / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2018. — 10 мая. — С. 3.

**Елізарава, Ж.** З іх пачынаецца армія / Жанна Елізарава // Кобрынскі веснік. - 2018. — 21 красавіка. — С. 1, 2.

Ваенны камісарыят Кобрынскага і Жабінкаўскага раёнаў — гэта згуртаваная каманда спецыялістаў.

**Бялоў, Д.** Быць ваенным наканавана лёсам / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2017. — 22 лютага. — С. 1, 2.

Жыццёвы шлях былога ваеннага камісара аб`яднанага гарадскога і раённага ваеннага камісарыята М. С. Кавальчука.

**Пятроў, А. А**. Як жыве и працуе адасобленая група / Аляксей Анатольевіч Пятров ; [гутарыла] Людміла Вольчык // Сельская праўда. - Жабінка, 2017. - 22 лютага. - С. 2.

**Мельнік, Р.** Трымаць порах сухім / Раман Мельнік, Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2016. — 24 верасня. — С. 1, 2.

На Кобрыншчыне адбыліся паказныя заняткі па арганізацыі збораў ваеннаабавязаных.

**Пашкович, Л**. Наш военкомат — лучший! / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2016. — 30 лістапада. — С. 1.

По итогам работы Кобринский районный военный комиссариат признан лучшим в области.

**Аб'ядналіся** ваенкаматы // Народная трыбуна. - 2015. — 30 кастрычінка. — С. 3.

Адбылося аб'яднанне Кобрынскага і Жабінкаўскага ваенкаматаў - новая назва "Ваенны камісарыят Кобрынскага і Жабінкаўскага раёнаў".

**Косціна, Л.** Утворана адасобленая група ваенкамата / Людміла Косціна // Сельская праўда. — Жабінка, 2015. — 25 лістапада. — С. 4 : фот.

Адбылося зліццё Жабінкаўскага і Кобрынскага ваенных камісарыятаў.

**Ніжнік, Н.** Новая гісторыя ваенных камісарыятаў / Наталля Ніжнік // Кобрынскі веснік. - 2015. — 17 кастрычніка — С. 3.

Да ваеннага камісарыята Кобрынскага раёна далучылася адпаведная ўстанова Жабінкаўскага раёна.

**Круглов, И.** Кобринский РВК – лучший в области / [Игорь Круглов ; беседовала] Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. - 2014. - 17 июля. С. 3.

Военный комиссар полковник И. Круглов – о деятельности местного органа военного управления.

**Савчук, М.** Гости из военкомата / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2013. — 10 января. — С. 2.

В рамках благотворительной акции сотрудники Кобринского военкомата подготовили для социального приюта в Борисовке сладкие подарки.

**Круглов, И. В.** И снова призыв / И. В. Круглов ; [беседовала] Маргарита Савчук// Кобрин-информ. – 2012. – 29 марта.

Кобринский комиссариат возглавил подполковник И. В. Круглов.

**Круглоў, І.** "Прэстыж арміі сёння высокі, як ніколі..." / [Ігар Круглоў ; гутарыў] Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2012. - 22 лютага. - С. 2.

Гутарка з ваеным камісарам Кобрынскага ваенкамата І. Кругловым.

**Мельнік, Р**. Стануць абаронцамі Айчыны / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2012. - 18 красавіка. - С. 2.

У Кобрынскім ваенкамаце прызыўная кампанія ў самым разгары.

**Мельнік, Р.** У армію - як у школу жыцця / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2012. - 5 верасня. - С. 2.

Мерапрыемствы па прызыву на тэрміновую ваенную службу праходзяць у Кобрынскім ваенкамаце.

**Сартаков, А.** Готовность в мирное время / Александр Сартаков // Кобрынскі веснік. - 2012. - 13 кастрычніка. - С. 2.

Кобринский военкомат провел показательные занятия по системе территориальной обороны.

**Васюк, Н.** Военкомату - "отлично" / Наталья Васюк // Кобрин-информ. - 2010. - 28 января. - С. 2.

**Мельнік, Р.** Справа гонару / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2010. - 29 мая. - С. 2.

Кобрынскі раённы ваенкамат.

**Медаль** ад фонду імя Жукава // Кобрынскі веснік. - 2009. - 15 ліпеня. - С. 3.

Знакам "За мужнасць і любоў да Айчыны 1941-1945 гг." ад фонду імя Жукава ўзнагароджаны ваенны камісар Кобрынскага РВК В. Пракапюк.

**Васюк, Н.** Военкомат в будни и праздники / Наталья Васюк // Кобрин-информ. - 2008. - 10 апреля. - С. 4.

**Кобринский** военкомат в числе лучших // Кобрин-информ. - 2008. - 10 января.

**Мельнік, Р.** Не толькі прызыў на службу / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2008. - 5 красавіка. - С. 3.

Кобрынскі раённы ваенкамат.

**Пустовой, Е.** Главный штаб призыва и обороны / Е. Пустовой // Кобрин-информ. – 2005. – 13 октября. – С. 2.

**Балецкі, Я.** У ваенкаматаў – сваё свята / Я. Балецкі // Кобрынскі веснік. – 2003. – 5 красавіка. – С. 1.

8 красавіка - Дзень ваенных камісарыятаў.

Кобрынскі раён
Кобрын
Жабінкаўскі раён
Жабінка
Кобрынскі раённы ваенкамат